| УЗГОДНЕНА | ЗАЦВЕРДЖАНА | ЗАЦВЯРДЖАЮ |
| --- | --- | --- |
| Намеснік старшыні Шаркаўшчынскага райвыканкама Ю.А.Васілеўскі | Пастановай Бюро Шаркаўшчынскага РК ГА "БРСМ" № 2 ад 31.03.2022 | Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Шаркаўшчынскага райвыканкама, старшыня РА ГА "БСЖ" Л.У.Стома 22 красавіка 2022 г. |

# ПАЛАЖЭННЕ
## аб правядзенні III раённага літаратурнага конкурсу, прысвечанага Году гістарычнай памяці

**Мэта:** героіка-патрыятычнае выхаванне насельніцтва рознага ўзросту, развіццё і папулярызацыя традыцый аматарскай творчасці.

**Задачы:** - выхоўваць інтарэс да роднай мовы, да літаратурнай спадчыны беларускага народа.

- садзейнічаць выяўленню, развіццю і рэалізацыі творчага патэнцыялу, літаратурна-мастацкіх здольнасцей грамадзян, прастымуляваць і падтрымаць іх творчую дзейнасць.
- звярнуць увагу грамадства на неабходнасць выхоўвання асноўных маральных якасцей і агульначалавечых каштоўнасцей.

**Арганізатары конкурсу**:

- аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Шаркаўшчынскага раённага выканаўчага камітэта (далей – райвыканкам);
- Шаркаўшчынская раённая арганізацыія грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз жанчын";
- Шаркаўшчынскі раённы камітэт грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі";

**Удзельнікі конкурсу**

Конкурс праводзіцца ў наступных узроставых катэгорыях: ад 10 да 13 гадоў; ад 14 да 17 гадоў; ад 18 да 31 гадоў; ад 31 года і старэйшыя.

**Тэмы конкурсных работ**

Для чатырох узроставых катэгорый:

“Мне/нам засталася спадчына…”

“З любоўю да роднага краю”

“Тое месца на карце быллём зарасло, але памяць аб ім застанецца”

“Праз усе нягоды і адлегласці мне свецяць вочы роднае зямлі”

“Шчасце жыць у мірнай краіне”

“Скарбы маёй сям’і”

“Лёс чалавека”

**Жанры конкурсных твораў:** апавяданне, нарыс, эсэ, п’еса, верш, паэма і г.д.

Творы, дасланыя на конкурс, аўтарам не вяртаюцца.

**Парадак і ўмовы правядзення конкурсу:**

1. У конкурсе прымаюць удзел усе жадаючыя ва ўзросце ад 10 гадоў (узрост удзельнікаў не абмежаваны).

2. Работы на конкурс прадстаўляюцца на беларускай і рускай мовах.

3. Прыём конкурсных работ ажыццяўляецца з 25 красавіка па 20 мая 2022 года ўключна па электроннай пошце svitanak.sharck@mail.ru альбо ў друкаваным варыянце па паштоваму адрасу: РЦК, Клакоўскай Але Уладзіміраўне, вул. Энгельса, д.2, г.п.Шаркаўшчына, 211921. Даведкі па тэлефонах: А1 - +375291133565; МТС - +375292976626.

4. Творы падаюцца на конкурс адным файлам у рэдактары Microsoft Word у фармаце “doc” ці “docx”. Аб’ём твораў павінен быць не больш за 5 друкаваных лістоў (шрыфт – Times New Roman, памер – 16 пт).

Удзельнікі маюць права падаваць на конкурс творы ў розных жанрах, у такім выпадку творы дасылаюцца асобнымі файламі.

5. Асноўнаму тэксту павінна папярэднічаць наступная інфармацыя-заяўка (дадзеныя аўтара):

-прозвішча, імя, імя па бацьку;

-дата нараджэння, колькі поўных гадоў;

-хатні адрас, нумар тэлефона і электронны адрас;

-месца вучобы (назва школы, клас, прозвішча настаўніка, які рыхтуе да ўдзелу ў конкурсе, нумар тэлефона і адрас электроннай пошты настаўніка) ці асноўнае месца працы канкурсанта (з указаннем пасады);

- назва твора.

Увага! Дадзеныя, напісаныя ў заяўцы, будуць аддрукаваныя ў дыпломе, таму рэкамендуем правяраць правільнасць запаўнення заяўкі перад адпраўкай.

Удзел у конкурсе азначае поўнае і безумоўнае прыняцце правіл дзадзенага палажэння.

**Арганізацыйны камітэт:**
**Клакоўская Ала Уладзіміраўна** – кіраўнік народнага літаратурна-музычнага аб'яднання "Світанак" Шаркаўшчынскага РЦК;
**Кавалеўская Вераніка Ігараўна** – першы сакратар Шаркаўшчынскага раённага камітэта ГА "БРСМ";
**Фромертас Алена Цімафееўна** – галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і справах моладзі Шаркаўшчынскага райвыканкама;

**Журы:**
**Васілеўскі Юрый Анатольевіч** – намеснік старшыні Шаркаўшчынскага райвыканкама, старшыня раённай арганізацыі Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Белая Русь";
**Стома Людміла Уладзіміраўна** – начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Шаркаўшчынскага райвыканкама;
**Праўдзін Віктар Аляксандравіч** – пісьменнік, празаік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі;
**Кукуць Міледзій Мікалаевіч** – паэт-празаік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, сябра народнага літаратурна-музычнага аб'яднання "Світанак";
**Лагун Віктар Ільіч** – паэт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, сябра народнага літаратурна-музычнага аб'яднання "Світанак";
**Бацвінёнак Рамуальда Антонаўна** – настаўніца рускай мовы і літаратуры.
**Піланц Алена Дзмітрыеўна** – настаўніца беларускай мовы і літаратуры.
**Райчонак Сяргей Дзмітрыевіч** – карэспандэнт раённай газеты "Кліч Радзімы".
**Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў:**

1.Падвядзенне вынікаў 21-26 мая 2022 г. Узнагароджванне пераможцаў адбудзецца 27 мая 2022 г.

2. Журы вызначае 3 прызавыя месцы ў кожным конкурсным жанры і ў кожнай узроставай групе.

3. Удзельнікі конкурсу:

- ва ўзроставай катэгорыі 10-13 гадоў, заняўшыя першае, другое, трэцяе месца, узнагароджваюцца памятнымі падарункамі ад раённай арганізацыі ГА "Беларускі саюз жанчын";

- ва ўзроставай катэгорыі 14-17 гадоў, заняўшыя першае, другое, трэцяе месца, узнагароджваюцца памятнымі падарункамі ад раённай арганізацыі ГА "БРСМ";

- ва ўзроставай катэгорыі 18-31 год, заняўшыя першае, другое, трэцяе месца, узнагароджваюцца памятнымі падарункамі ад аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Шаркаўшчынская райвыканкама з сродкаў, выдаткаваных на арганізацыю дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі;

- ва ўзроставай катэгорыі ад 31 года і старэйшыя, заняўшыя першае, другое, трэцяе месца, узнагароджваюцца памятнымі падарункамі ад раённй арганізцыі ГА "БСЖ".

Усе удзельнікі конкурсу узнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.

4. Лепшыя творы могуць быць надрукаваныя на старонках раённай газеты "Кліч Радзімы".

5. Журы конкурсу мае права не прысуджаць тое ці іншае месца, дзяліць прызавыя месцы паміж яго ўдзельнікамі, а таксама можа ініцыіраваць увядзенне дадатковых прызавых месцаў для ўзнагароджвання і заахвочвання ўдзельнікаў.

6. Рашэнне журы афармляецца пратаколам, які падпісваецца кожным членам журы. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не належыць. Пратаколы членаў журы ўдзельнікам конкурса не прадастаўляюцца і абнародаванню не падлягаюць.

7. Аргкамітэт прымае пажаданні і прэтэнзіі па арганізацыі конкурсу ў пісьмовым выглядзе на электронную пошту alka_mih78@mail.ru , а так сама астаўляе за сабой права ўнясення ў дадзенае Палажэнне змяненняў і дапаўненняў, аб чым будзе інфармаваць удзельнікаў конкурсу дадаткова.